**Грыгароўскі, Л.** Бой ля вёскі Платы / Л. Грыгароўскі // Віцебскі рабочы. – 1993. – 3 крас. – С. 4.

# БОЙ ЛЯ ВЁСКІ ПЛАТЫ

Прачытаў у вашай газеце ад 28 студзеня артыкул Д. Газіна «Дзякуй вам, райцаўцы!» і вырашыў дапоўніць яго расказ. Бо з некаторымі эпізодамі я не згодны.

Лічу, што асноўны цяжар бою ля вёскі Платы прынялі на сябе атрад А. П. Дзіка і асобы атрад ваенных, які быў закінуты з-за лініі фронту і дэсантаваўся ў пасёлку Ноўка.

27 сакавіка наш атрад накіроўваўся ў вёску Вярэчча Гарадоцкага раёна на разгром паліцэйскага гарнізона. Увечары мы спыніліся ў Канашах, каб павячэраць і дачакацца поўнай цемры.

У гэты час разведка далажыла, што на разгром нашага атрада ў Ноўку, дзе раней быў шкляны завод, накіроўваюцца два нямецкія батальёны. Адзін размясціўся на начлег у Лушчысе, а другі – у Кабішчы.

Каб затрымаць фашыстаў, што рухаліся з Кабішча, быў пакінуты ўзвод партызан пад камандаваннем Л. Лабоўкіна. Яму далі тры кулямёты. Мяне з кулямётам пакінулі ў першым узводзе, які накіраваўся ў вёску Платы. Насельніцтва мы з дамоў выселілі. Запалілі печы і пачалі чакаць немцаў. Для ўзмацнення нашаму ўзводу быў прыдадзены кулямётчык М. Сільніцкі з атрада Райцава.

Міхаіл Сільніцкі размясціўся на паддашку першай хаты пры ўездзе ў вёску, а я – на паддашку другой. Перад Міхаілам была пастаўлена задача біць з кулямёта па галаўных сілах, а мне – біць па хвасце калоны.

У двары першага дома стаіўся і ротны мінамётчык з нашага атрада І. М. Янкевіч.

У 10 гадзін раніцы паказалася калона фашыстаў. Бакавыя і галаўны дазор ішлі на лыжах. Наперадзе было чалавек сорак, за імі рухалася 76-міліметровая гармата, а пасля – калона коней. Бой працягваўся да чатырох гадзін дня, пакуль другі батальён немцаў не зайшоў з тылу. Нам давялося адступіць, паколькі боепрыпасы былі на зыходзе. Адступалі праз вёску Молчаці.

Узвод Л. Лабоўкіна, пакінуты для сустрэчы нямецкага батальёна каля вёскі Стырыкі, нікога не дачакаўся, бо здрадніца Лапавухава, мужа і сына якой мы расстралялі за сувязь з фашыстамі, сустрэла немцаў у вёсцы Лапакова і правяла іх другой дарогай, мінуўшы нашу засаду. Таму і зайшлі яны нам з тылу.

У гэтым баі мы знішчылі каля 60 коней, немцы страцілі 300 чалавек забітымі і параненымі. І ў нас былі страты: загінулі два капітаны з асобага атрада, якіх параненымі фашысты спалілі ў вёсцы Коставічы.

Атрад Райцава быў размешчан у трох пунктах: на дарозе да вёскі Полцева, на могілках у Рэчыцы і на ўскраіне лесу па прамой дарозе ў Ноўку.

**Л. ГРЫГАРОЎСКІ, былы кулямётчык атрада А. П. Дзіка**